Водгук
на аўтарэферат дысертацыі Ажэшкоўскай Ірыны Мікалаеўны
"Развіццё архітэктуры ўніяцкіх храмаў Беларусі ў канцы XVI – XIX стст."
прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата архітэктуры па
спецыяльнасці 05.23.23 Архітэктура будынкаў и пабудоў, гарадскіх і
вясковых паселішчаў, паміжзаселеных тэрыторый.

Дысертацыя Ажэшкоўскай Ірыны Мікалаеўны прысвечана вывучэнню былых каменных уніяцкіх храмаў Беларусі канца XVI – першай паловы XIX стст. якія захаваліся, альбо былі перабудаваныя ці выяўленыя ў працэсе архіўных даследаванняў.

Даследаванне І.М.Ажэшкоўскай грунтуецца на грунце гісторыка-тыпалагічнага метада, ажыццяўленне якога дазволіла прадставіць навукова абгрунтаваную работу ў якой вызначаны характэрныя рысы ўніяцкіх храмаў як унікальнай з'явы ў гісторыі мураванага сакральнага дойлідства Беларусі. У дысертацыйным даследаванні прааналізаваны сучасны стан помнікаў мураванага дойлідства ў адпаведнасці з тэмай даследавання і выяўлены перспектывы актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны.

Стуруктура дысертацыйнай работы пабудавана лагічна. У першай главе разглядаюцца крыніцы, гістарыяграфія і метадалагічныя асновы даследавання. У першую чаргу гэта краязнаўчая, мемуарная і рэлігійна-палітычная літаратура і архіўныя дакументы. Выяўленчыя крыніцы далі магчымасць даследчыку правесці графааналітычны аналіз і выканаць графічныя рэканструкцыі страчаных аб'ектаў.

Архітэктурна-тыпалагічны метад дазволіў вылучыць 51 аб'ект мураванай уніяцкай архітэктуры, а таксама некаторыя элементы інтэр'ера ў драўляных храмах.

У другой палове паказаны тыя ўмовы, якія дазволілі зрабіць выбар аб'ёма планіровачных пабудоў і мастацка-стылістычных вырашэнняў храмаў. Пры гэтым быў зроблены аналіз арганізацыйнай дзейнасці ўніяцкіх мітрапалітаў і мецэнатаў, а таксама рашэнняў Замойскага сабора 1720 г.

Таксама зроблены грунтоўны аналіз дзейнасці ордэна базільянаў і канфесійнай дзейнасці палітыкі Расійскай імперыі ў адносінах да ўніяцкай царквы, асабліва пасля 1828 г.

Варта адзначыць прапанаваную аўтарам перыядызацыю развіцця ўніяцкіх храмаў. Першы этап (канец XVI – першая чвэрць XVIII стст.), другі этап (сярэдзіна-другая палова XVIII ст.) і трэці этап (канец XVIII – першая палова XIX стст.).

Трэцяя глава апавядае пра асаблівасці аб'ёмна-планіровачнай структуры ўніяцкіх храмаў на кожным з этапаў іх развіцця.

Так у сярэдзінеXVIII ст. прыярытэтам стала віленскае барока, а ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. гэта быў барочны класіцызм, а потым класіцызм.

Отзыв поступил в Совет Д.02.05.15
26.05.2023 [подпись] Протасова Ю.А.

БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ
ТЭХНІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ
26 05 2023
УВАХ № 1159

С отзывом ознакомлена
26.05.2023 [подпись] Ажешковская И.Н.

У чацьвёртай главе ідзе гаворка пра арганізацыю сакральнай прасторы ўніяцкіх храмаў, у тым ліку пра ўніяцкія іканастасы і пра іх кампазіцыйныя і сімвалічныя асаблівасці.

Работа выканана на належным даследчыцкім узроўні, з выкарыстаннем вялікай колькасці крыніц, прычым аўтар дысертацыі мае 44 навуковыя публікацыі па тэме дысертацыі.

Хачу адзначыць, што дысертацыйнае даследаванне Ажэшкоўскай Ірыны Мікалаеўны "Развіццё архітэктуры ўніяцкіх храмаў Беларусі ў канцы XVI – XIX стст." адпавядае патрабаванням, што прад'яўляюцца да вышэйназваных навуковых работ і аўтар заслугоўвае прысваення вучонай ступені кандыдата архітэктуры па спецыяльнасці 05.23.23 "Архітэктура будынкаў и пабудоў, гарадскіх і вясковых паселішчаў, паміжзаселеных тэрыторый".

Я, Трусаў Алег Анатольевіч, даю дазвол на размяшчэнне водгука на аўтарэферат дысертацыі Ажэшкоўскай Ірыны Мікалаеўны "Развіццё архітэктуры ўніяцкіх храмаў Беларусі ў канцы XVI – XIX стст.", прадстаўленай на саіскание вучонай ступені кандыдата архітэктуры па спецыяльнасці 05.23.23 "Архітэктура будынкаў и пабудоў, гарадскіх і вясковых паселішчаў, паміжзаселеных тэрыторый" на сайце ўстановы адукацыі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

Дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат гістарычных навук, дацэнт

А.А.Трусаў

Отдел правовой и кадровой работы

Подлинность подписи удостоверяю
Ведущий специалист отдела правовой и кадровой работы Ю.А.Рыбакова
. .2023